## § 67. Зваротны займеннік *сябе*

**425.** Прачытайце. Вызначце тып тэксту і яго кампазіцыйную схему. Падбярыце да тэксту загаловак у адпаведнасці з асноўнай думкай.

Кожны чалавек носіць у **сабе** храм. Штодзень, з году ў год. Толькі ў адных ён маўчыць, а ў другіх звоніць ва ўсе свае званы. Але ёсць яшчэ і трэція. Яны не думаюць пра **сябе**. Званы раздзіраюць такому чалавеку душу. Аднак ніхто гэтага звону[м] не чуе — чалавек не выпускае яго з **сябе**. Апошнія адыходзяць першымі — раней за ўсіх. Ад карозіі* храма, які яны носяць у **сабе** *(Паводле Я. Сіпакова)*.

Пра якія званы згадвае аўтар?
На што ўказвае выдзелены займеннік? У якіх формах ён ужываецца?

**426.** Прачытайце табліцу. Параўнайце канчаткі займеннікаў *сябе* і *ты* ва ўскосных склонах. Дапоўніце табліцу формамі займенніка *сябе*.

| Склон | Скланенне займеннікаў *сябе, ты* | |
|---|---|---|
| Н. | — | *т***ы** |
| Р. | *сяб***е** | *цяб***е** |
| Д. | *саб***е** | *таб***е** |
| В. | … | *цяб***е** |
| Т. | *саб***ой** *(-ою)* | *таб***ой** *(-ою)* |
| М. | … | *(пры) таб***е** |

Складзіце і запішыце сказы з займеннікам *сябе* ў вінавальным склоне.

**Зваротны** займеннік ***сябе*** ўказвае на таго, хто ўтварае дзеянне. Ён можа ўказваць на 1, 2 ці 3-ю асобу ў адзіночным і множным ліку: ***Я*** *не пазнаю* ***сябе****.* ***Ты*** *не пазнаеш* ***сябе****.* ***Ён (яна, яно)*** *не пазнае* ***сябе****.* ***Мы*** *не пазнаём* ***сябе****.* ***Вы*** *не пазнаяце* ***сябе****.* ***Яны*** *не пазнаюць* ***сябе****.*

У сказе займеннік ***сябе*** з'яўляецца дапаўненнем: *Кожны чалавек носіць* ***у сабе*** *ненапісаную кнігу — кнігу цікавую, непаўторную* (М. Танк).


Правообладатель Национальный институт образования

**427.** Прачытайце, устаўляючы займеннік *сябе* ў неабходнай форме.



Вострыᵐ хвост, нібыта вілы,
Дзі..ны выгін ма..ць крылы.
Прыл..ціць да нас калі —
Лепіць дом … з з..млі.

У лесе — гаспадар, не госць,
Шмат у яго іголак ёсць.
Але не шыцьᶜ, не цыраваць*,
… ад смерці ратаваць.



Адгадайце загадкі. Замест якіх слоў ужываецца займеннік *сябе*?

Спішыце загадкі, устаўляючы прапушчаныя літары. Растлумачце напісанне займеннікаў. Вызначце іх разрад, склон, падкрэсліце як члены сказа.

Якое слова мае значэнне ‘зашываць дзірку, пераплятаючы ніткі тым або іншым спосабам’?

Займеннік ***сябе*** суадносіцца з назоўнікам, але не мае роду і ліку. Змяняецца па склонах, як займеннік *ты*. Не мае формы назоўнага склону.

У родным і вінавальным склонах займеннік *сябе* мае форму *сябе*, у давальным і месным — *сабе*. У творным склоне мае варыянтныя канчаткі **-ой, -ою**: *саб**ой***, *саб**ою***.

**428.** Устаўце ў фразеалагізмы займеннік *сябе* ў патрэбнай склонавай форме. Вызначце, у якіх формах ён ужываецца.

| Фразеалагізм | Значэнне |
|---|---|
| Здрадзіць … | ‘зрабіць што-небудзь насуперак сваім перакананням’ |
| Авалодаць … | ‘вярнуць страчанае самавалоданне’ |
| Само за … гаворыць | ‘не мае патрэбы ў тлумачэнні’ |
| Сам … не рад | ‘незадаволены самім сабою’ |

- З двума фразеалагізмамі складзіце сказы.



Правообладатель Национальный институт образования

**429.** Спішыце сказы, раскрываючы дужкі. Падкрэсліце займеннікі як члены сказа.

1. Дазволь жа нізка пакланіцца *(ты)*, бацькоў маіх зямля *(І. Скурко)*. 2. Збудавалі ля шашы *(сябе)* хатку мурашы[сн] *(У. Шпадарук)*. 3. Усіх чаруе лірыка *(сябе)*, высокімі пачуццямі пранізвае *(М. Вяршынін)*. 4. Дзвіна! Дзвіна! І слова звоніць, як толькі ўспомніш пра *(ты)* *(П. Броўка)*. 5. Быць самім *(сябе)* і не лёгка[ф], і не проста *(М. Рудкоўскі)*. 6. Я таксама духмянага[м] чаю з іван-чаю *(сябе)* заварыў *(Х. Гурыновіч)*.

**430.** Выканайце інтэрактыўнае заданне «Правапіс займеннікаў».

## § 68. Прыналежныя займеннікі

**431.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго тып. Абгрунтуйце сваю думку.

Кожны з нас — Я. А калі мы сабраліся ў групу або калектыў, з'яўляецца яшчэ адно важнае слова — **мы**. Пры гэтым ты сам заўважаеш, што, прыходзячы дадому, расказваеш: «Мы сёння пісалі дыктант», «Наш клас у нядзелю пойдзе ў тэатр». Чаму так адбываецца? А таму, што для кожнага чалавека вельмі важныя[м] справы таго калектыву, у які ён уваходзіць. Гэта твая сям'я, твой клас, твае сябры *(Паводле выдання «Чалавек і свет»)*.

Якое значэнне маюць словы *наш, твой*? На прыналежнасць якой асобе яны ўказваюць? Якія вы яшчэ ведаеце прыналежныя займеннікі?

**Прыналежныя** займеннікі ўказваюць на прыналежнасць прадмета асобе ці іншаму прадмету: *я* — ***мой***, *ты* — ***твой***, *ён, яно* — ***яго***, *яна* — ***яе***, *мы* — ***наш***, *вы* — ***ваш***, *яны* — ***іх***: *Матуля, колькі весняга святла* ***твае*** *імя святое навявае!..* (З. Марозаў).

У сказе прыналежныя займеннікі з'яўляюцца азначэннем: *За* ***наш*** *духмяны каравай сягоння чалавек спакойны* (В. Гардзей).


Правообладатель Национальный институт образования